или **«НЕТ»** *(показываем знаками «плюс» и «минус»).*

1. Бывает ли такое, что в некоторых словах согласные [л], [в],[д],[т] не произносятся? (*Да).*
2. Сочетание СН является сигналом орфограммы непроизносимых согласных? (*Да).*
3. Сочетание СН единственное *ошибкоопасное* сочетание в словах с непроизносимыми согласными? (*Нет).*
4. Таких сочетаний 5? (*Да).*
5. Чтобы проверить слова с непроизносимыми согласными в корне слова, нужно несколько раз проговорить слово? (*Нет).*
6. Чтобы проверить слова с непроизносимыми согласными в корне слова, нужно подобрать однокоренное слово, в котором этот согласный произносится ясно? (*Да).*

**VII. Этап контроля и самоконтроля.**

Как вы усвоили данную тему, помогут определить критерии. Какие пункты критериев вы можете оценить?

| | |
|---|---|
| *Буду распознавать слова с непроизносимыми согласными в корне* | |
| *Буду уметь проверять слова с непроизносимыми согласными в корне* | |

Первый пункт оценим, работая в паре. Вспомните «узелки», которые мы завязали на память и назовите друг другу пять сочетаний, которые являются сигналом для орфограммы непроизносимых согласных. *(Начинает 1 вариант с первым сочетанием, второй – со вторым, первый – третьим и т.д. В графе Оценка ставят знак «!» (Классно!) или «?» (Знаю, но непрочно).*

Второй критерий оцените по результату выполнения упражнения 67.

Почему не можем оценить себя по последнему пункту критериев? *(Напишу без ошибок под диктовку 3-4 предложения, в которых встретятся слова с новой орфограммой).* Не писали под диктовку.

Запишем предложения. Если встретятся слова с новой орфограммой, подчеркните их. Буквы, которыми обозначаются на письме непроизносимые согласные, пишите так, как прописывали в минутке чистописания.

*(Учитель диктует текст, один учащийся пишет за доской, остальные самостоятельно. Проверяют и оценивают по последнему критерию).*

*Текст: Стоит прекрасный зимний денек. Солнце освещает всю окрестность. Радостные солнечные зайчики скачут по стволам деревьев. На березу опустилась стайка прелестных птичек.*

**VIII. Подведение итогов.**

Встаньте, у кого по всем критериям оценка «!» *(Классно).*

У кого есть знак «?»

Что нужно сделать, чтобы было «Классно»? *(Закрепить, повторить, выучить).*

Вернемся к нашему ключевому вопросу – «Можно ли поймать согласные звуки «невидимки–неслышинки?» *(Можно).* Что для этого нужно знать? *(Знать сочетание, которые подают сигналы, уметь подбирать проверочные слова).*

**IX. Информация о домашнем задании.**

Дома будет возможность потренироваться в нахождении слов с непроизносимыми согласными в корне. Поможет в этом упр. 68.

**X. Рефлексия.**

Кто знает, какие согласные могут не произноситься в корнях некоторых слов, поднимите обе руки. Назовите эти согласные.

Кто знает, какую информацию запоминали, завязывая «узелки», встаньте. Какую?

Для кого работа на уроке была классной, покажите знак *(рука сжата в кулак, большой палец вверх).*

Для меня урок тоже был вот таким (жест *«классно»*).

*Дата поступления в редакцию: 08.06.23*

# ПЛАН-КАНСПЕКТ УРОКА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА” Ў XI КЛАСЕ ПА ТЭМЕ “СВАЕ І ЧУЖЫЯ Ў АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА “ЗНАК БЯДЫ”. МАСТАЦКАЯ СІМВОЛІКА ТВОРА”

*Прымшыц Алена Юр’еўна*

**Тып урока:** урок мастацкага аналізу твора.

**Навучальная мэта:** плануецца, што да канца ўрока вучні ахарактарызуюць і параўнаюць вобразы немцаў і паліцаяў; высветляць прычыны здрады “сваіх” людзей; вытлумачаць ролю сімвалаў у творы; высветляць сэнс назвы твора.

**Задачы развіцця і выхавання:**

спрыяць развіццю ўмення супастаўляць, параўноўваць і рабіць высновы пры характарыстыцы герояў літаратурнага твора і тлумачэнні ролі сімвалаў у мастацкім тэксце;

ствараць умовы для пошукавай, даследчай дзейнасці вучняў;

спрыяць развіццю камунікатыўных, інтэлектуальных здольнасцей вучняў;

садзейнічаць выхаванню гуманістычных ідэалаў;

ствараць умовы для ўсведамлення вучнямі асобаснай значнасці падзей Вялікай Айчыннай вайны, фарміравання адказнасці за гістарычную памяць.

**Ход урока**

*Геніяльным з'яўляецца толькі такі твор, які адначасова ўяўляе сабой сімвал і дакладнае ўвасабленне рэчаіснасці.*
*Гі дэ Мапасан*

**I. Арганізацыйны этап.**

Добры дзень, сённяшні ўрок я хачу пачаць са слова "памяць"...З якім словам, на вашу думку, яно мае цесную сувязь? *(Мінулае, тое, што ўжо адбылося...)*

Згадзіцеся, што без ведання мінулага няма сённяшняга. Мінулае ўваскрашае часам страшныя малюнкі, але гэта наша з вамі гісторыя. Праслухайце музыку, прагледзьце фотарад і падзяліцеся сваімі думкамі ад пачутага і ўбачанага. Гэтыя жахлівыя малюнкі вайны засталіся ў памяці кожнай беларускай сям'і, яны нясуць боль і жах. *(Фотарад з выявамі спаленых вёсак Віцебшчыны з альбома "Вяртанне"[1] пад музыку грэчаскага кампазітара Вангеліса).*

Так, вайна не абмінула ніводнай беларускай сям'і, на Беларусі загінуў кожны трэці, безумоўна, яна прайшлася жахлівымі крокамі і па вашых продках. Узгадайце гісторыі вашых сем'яў, звязаныя з вайной. *нрасказваюць гісторыі сваіх сем'яў). (Вучні расказваюць гісторыі сваіх сем'яў).*

**II. Паведамленне тэмы ўрока, мэтавызначэнне.**

Нельга застацца абыякавым да ваеннай тэмы. На мінулых уроках мы з вамі казалі пра В. Быкава як пра ваеннага аўтара, гаварылі, што В. Быкаў паказвае вайну шматпланава: і вайскоўцаў, і партызан,і мірных жыхароў, якія засталіся ў тыле.

Тэма сённяшняга ўрока "Свае і чужыя ў аповесці "Знак бяды" В. Быкава. Мастацкая сімволіка твора". Як вы думаеце, хто схаваны пад словам "свае" і "чужыя"? *(Мяркуем, што сёння будзем разважаць пра паліцаяў і немцаў).*

Тэма даволі складаная...Знайдзіце ў першай частцы тэмы ўрока слова, трактаваць якое можна двояка (свае/чужыя). Выкажыце меркаванне пра мэты, якія мы павінны будзем вырашыць на ўроку. *(Адна з мэт - вытлумачыць значэнне паняццяў "свае" і "чужыя" ў творы, параўнаць вобразы немцаў і паліцэйскіх, высветліць прычыны здрады былых "сваіх" людзей).*

Прачытайце, калі ласка, эпіграф. Якую яшчэ мэту вы бачыце ў ім? *(Вытлумачэнне сімвалічных вобразаў у творы).*

Скажыце, на вашу думку, ці звязана назва твора з другой часткай тэмы?

*(Так, звязана. Адсюль яшчэ адна мэта – тлумачэнне сэнсу назвы твора).*

**III. Праверка дамашняга задання.**

Дома вы павінны былі адабраць прачытаныя раней творы В. Быкава, у якіх разглядаліся вобразы паліцэйскіх, і высветліць, якімі якасцямі надзяліў іх аўтар.

*(У апавяданні "Сваякі" 1966 г. аўтар правёў думку, што людзі, якія здрадзілі свайму народу, Бацькаўшчыне, - страшнейшыя за ворагаў-іншаземцаў. В. Быкаў імкнецца зразумець, што прымушае чалавека стаць здраднікам, страляць па сваіх).*

У якім яшчэ творы аўтар узнімае гэтую праблему? Якая асноўная думка твора? *(Рыбак з аповесці "Сотнікаў" у палоне згаджаецца стаць паліцаем, каб выжыць, а потым "адмыць свае грахі". Жыццё ж паказвае, што нельга крыху здрадзіць Радзіме, сябру і застацца сумленным чалавекам).*

Так, вобразы паліцэйскіх даволі часта сустракаюцца ў аповесцях

В. Быкава. Давайце высветлім, ці змяніліся яго погляды на гэтую праблему за 16 год, якія аддзяляюць твор "Сваякі" і "Знак бяды"(з 1966 да 1982 года).

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу**

Зараз вы атрымаеце заданні па характарыстыцы вобразаў паліцэйскіх у аповесці "Знак бяды". Вы падзелены на чатыры групы, у кожнай групе ёсць мадэратар, ён атрымлівае заданне для групы ў настаўніка, размяркоўвае заданні ў групе, дапамагае з выкананнем заданняў па **запаўненні карткі-дасье вобраза** (дадатак 1). *На выкананне адводзіцца 7 хвілін, потым кожная група прадставіць вынік сваёй працы.* Першая група працуе з вобразам Зміцера Гужа, другая група – з вобразам Недасекі, трэцяя – з вобразам Патапа Каландзёнка, чацвёртая разглядае вобразы немцаў у творы.

*Работа па тэме ўрока ў групах. Пытанні для кожнай групы:*

**Група 1.**

Як паводзіць сябе Зміцер Гуж у час Вялікай Айчыннай вайны? Ахарактарызуйце яго дзеянні ў якасці паліцэйскага.

Ахарактарызуйце даваеннае жыццё героя, паказанае праз сцэны рэтраспекцый.

Што прывяло ў паліцыю Зміцера Гужа? Матывацыя гэтага ўчынку.

Выкажыце свае адносіны да выбару героя ў экстрэмальнай сітуацыі (разумею, але не апраўдваю; прыстасаванец; бесчалавечны пярэварацень).

**Група 2**

Як паводзіць сябе Антось Недасека у час Вялікай Айчыннай вайны? Ахарактарызуйце яго дзеянні ў якасці паліцэйскага.

Ахарактарызуйце даваеннае жыццё героя, паказанае праз сцэны рэтраспекцый.

Што прывяло ў паліцыю Антося Недасеку? Матывацыя гэтага ўчынку.

Выкажыце свае адносіны да выбару героя ў экстрэмальнай сітуацыі (разумею, але не апраўдваю; прыстасаванец, які імкнецца апраўдацца жыццём дзяцей, што яшчэ больш прыніжае вобраз; бесчалавечны пярэварацень).

**Група 3**

[1] Ждановіч, В.І. Альбом / В.І. Ждановіч [і інш.], аўт. вершаў і тэксту Р.Барадулін, . – Мінск: Беларусь, 1988. – 214 с.

Як паводзіць сябе Патап Каландзёнак у час Вялікай Айчыннай вайны? Ахарактарызуйце яго дзеянні ў якасці паліцэйскага.

Ахарактарызуйце даваеннае жыццё героя, паказанае праз сцэны рэтраспекцый.

Што прывяло ў паліцыю Патапа Каландзёнка? Матывацыя гэтага ўчынку.

Выкажыце свае адносіны да выбару героя ў экстрэмальнай сітуацыі

(разумею, але не апраўдваю; прыстасаванец, які імкнецца апраўдацца, што яшчэ больш прыніжае вобраз; бесчалавечны пярэварацень).

**Група 4**

Якімі ў аповесці паказаны фашысты?

Апішыце іх заняткі, адносіны да вяскоўцаў.

Як складаюцца адносіны паміж немцамі і паліцаямі?

Што яднае адных і другіх?

Прыйшоў час прадставіць вынікі сваёй працы, кожная група павінна запоўніць карткі на ўсіх герояў падчас выступлення іншых груп. *(У выніку такой працы вучні атрымліваюць **адукацыйны прадукт** – карткі-дасье вобразаў у падрыхтоўку да сачынення).*

Прыблізныя адказы 1 групы: Ад пачатку і да канца ворагам усяго людскога з'яўляецца Гуж. Ён не проста здраднік, а садыст і цынік. Цяжка сказаць, ад чаго ён больш упіваецца - ад гарэлкі ці ад улады, якую атрымаў. (" Я ж для вас вышэй, чым сельсавет, райкам, саўнаркам нават. Я ж магу любога, каго хочаш, *стрэльнуць. Мне ўсё давяраюць. Я магу і нагрworld...").* 

*Яго жорсткасць народжана з пачуцця крыўды за незаконнае раскулачванне ў часы калектывізацыі. Ён ідзе ў паліцыю, каб адпомсціць за гэтую крыўду. Мы яго разумеем, але не апраўдваем.*

**Прыблізныя адказы 2 групы:** *Недасека спачатку спадабаўся Сцепанідзе, бо ён ціхі, просіць ежы, а не патрабуе, а потым яна ў ім разгледзела страшнага чалавека. Ён баіцца, што яго брат-актывіст часоў калектывізацыі стане прычынай нападу на яго ў часы вайны, таму ідзе выслужыцца ў паліцыю. Ён прыстасаванец, які імкнецца апраўдацца жыццём дзяцей, што яшчэ больш прыніжае вобраз, бо дзеці потым не адмыюць пляму бацькі-здрадніка.*

***Прыблізныя адказы 3 групы:*** *Яшчэ больш небяспечным паказаны ў творы паліцай Каландзёнак. "Гэты ж горшы за Гужа," - гаворыць Пятрок. Ён бяздумна выконвае любы загад. Гэты чалавек заўсёды становіцца на бок мацнейшага, навучыўся ён гэтаму ў часы калектывізацыі. Для яго няма маральных прынцыпаў, ён пісаў даносы на сваіх і меў з гэтага ўласную выгаду, шукае яе і зараз. Ён бесчалавечны пярэварацень, яму ўсё роўна, каму служыць.*

***Прыблізныя адказы 4 групы:*** *Паліцаі п'юць, лаюцца, а фашысты трымаюць марку "высокакультурнай нацыі": не п'юць, карыстаюцца клазетам. Разам з тым, гэта не перашкаджае фельдфебелю здзекавацца са старой жанчыны. Яны паводзяць сябе на нашай зямлі як гаспадары, выганяюць старых з хаты. Да паліцаяў яны ставяцца з пагардай: хто ж паважае здраднікаў? Адны і другія нясуць страх і смерць, пагардліва ставяцца да сялян, зневажаюць і эксплуатуюць іх.*

На вашу думку, "свае" ці "чужыя" заслугоўваюць большага пакарання? *(Фашысты і паліцаі – нелюдзі, ворагі, за свае злачынствы яны заслугоўваюць аднолькавага пакарання).*

Чаму ж тады найбольшыя пакуты і смерць Сцепанідзе і Петраку прынеслі менавіта паліцаі? *(Адказ у Петраковых думках пра Гужа: калі быкаўскі герой уступае ў адзінаборства з фашыстамі, мы яшчэ спадзяёмся на шчаслівы фінал. Калі ж яму супрацьстаяць "свае", паліцаі і здраднікі, – такая надзея хутка гасне).*

Ці змяніліся погляды аўтара на гэтую праблему за 16 год? *(Не змяніліся. Ён па-ранейшаму лічыць, што людзі, якія здрадзілі свайму народу, Бацькаўшчыне, –страшнейшыя за ворагаў-іншаземцаў. Але ўпершыню ў творчасці В. Быкава жорсткасць і бесчалавечнасць паліцаяў паказана з такой паўнатой і паслядоўнасцю менавіта ў гэтым творы).*

Якія мэты ўрока мы з вамі вырашылі пры рабоце ў групах?

*(Мы прааналізавалі вобразы паліцаяў, высветлілі прычыны іх здрады, параўналі іх з вобразамі немцаў).*

Давайце цяпер паразважаем пра сімволіку твора. Твор насычаны мастацкімі сімваламі, якія можна падзяліць на непасрэдныя знакі-вешчуны бяды і глыбока сімвалічныя вобразы. Назавіце знакі, якія з'яўляюцца непасрэднымі вешчунамі бяды. *(Замерзлы жаўранак, варона, сны Петрака пра чарвей і пацука, сон Сцепаніды пра пажар).*

Успомнім азначэнне сімвала[2]. *(Гэта ўмоўнае, максімальна абагульненае абазначэнне з'явы, падзеі, што характарызуецца шматзначнасцю і ўвасабляе аўтарскую ідэю. Сімвалічны вобраз толькі часткова прыпадабняецца той з'яве, якую выяўляе, толькі намякае на яе, таму можа мець розныя тлумачэнні)*[3] .

Знайдзіце на ілюстрацыях Арлена Кашкурэвіча, зробленых да аповесці "Знак бяды", вобразы-сімвалы і патлумачце іх сэнс. *(Гэта апаленая ліпа – сімвал трагічнага мінулага. Крыж на Галгофе – сімвал пакут сялянства. Бомба – сімвал прыхаванага народнага гневу і немінучай расплаты).*

У вас на сталах ляжаць падручнікі па беларускай літаратуры пад рэдакцыяй М. І. Мішчанчука (с.335-337) і пад рэдакцыяй З. П. Мельнікавай (с.78-79, 81). Параўнайце вобразы-сімвалы, якія вылучаюць у творы аўтары падручнікаў.

Запішыце на картцы (дадатак 2) і патлумачце тыя сімвалічныя вобразы, якія ўспрымаюцца менавіта вамі як найбольш важныя ў творы, магчыма, яны не вылучаны аўтарамі падручнікаў. *(Спілаваны камсамольцамі крыж на Галгофе як сімвал зруйнавання ранейшых добрых традыцый. Сны галоўных герояў як псіхалагічнае прадвесце бяды. Маладзенькая ліпка на закінутым хутары як сімвал надзеі. Сама вайна*

[2] Слайд прэзентацыі "Сімвал".

[3] Ілюстрацыі Арлена Кашкурэвіча на слайдзе прэзентацыі.

*як сімвал вынішчэння нашага народа).*

**V. Падвядзенне вывадаў урока, выстаўленне адзнак.**

Успомніце прозвішча галоўных герояў твора. Ці не гаваркое яно? Чым багатыя нашы Багацькі? *(Гэта носьбіты векавой народнай маралі і мудрасці: жыць з працы рук сваіх, паважаць зямлю і аднавяскоўцаў, жыць з імі ў міры, зямля для іх святыня, карміцелька, яны жывуць па біблейскім залатым правіле паводзін (евангельская рэмінісцэнцыя).*

Знакаў бяды ў аповесці вельмі многа. Але чаму ж у загаловак вынесены толькі адзін? І які? Які ж са знакаў пісьменнік лічыць самым страшным, максімальным знакам бяды? *(Выказваюць свае меркаванні. Напрыклад, крыж на Галгофе ці вынішчэнне "сваімі" менавіта Багацькаў).*

Тады ў чым асноўны знак бяды? *(У тым, што на вайне былыя "свае" вынішчаюць лепшых. Забойства Багацькаў як знак вынішчэння носьбітаў народнай маралі, тых, што здзяйсняюць повязь вякоў і пакаленняў, а з іх гібеллю повязь ірвецца).*

Такая ж думка ляжыць і ў аснове рамана аднаго з любімых пісьменнікаў В. Быкава А. Камю "Чума": "У час чумы нас пакідаюць самыя лепшыя". І таму так узмоцнена эмацыйна гучыць антываенны пафас твора В. Быкава. У чым ён? *(Ніколі не павінна быць войнаў, трэба рабіць усё, каб іх папярэдзіць, таму што вайна вынішчае лепшых).*

**VI. Тлумачэнне дамашняга задання.**

Тады ў чым асноўны знак бяды? *(У тым, што на вайне былыя "свае" вынішчаюць лепшых. Забойства Багацькаў як знак вынішчэння носьбітаў народнай маралі, тых, што здзяйсняюць повязь вякоў і пакаленняў, а з іх гібеллю повязь ірвецца).*

Такая ж думка ляжыць і ў аснове рамана аднаго з любімых пісьменнікаў В. Быкава А. Камю "Чума": "У час чумы нас пакідаюць самыя лепшыя". І таму так узмоцнена эмацыйна гучыць антываенны пафас твора В. Быкава. У чым ён? *(Ніколі не павінна быць войнаў, трэба рабіць усё, каб іх папярэдзіць, таму што вайна вынішчае лепшых).*Прапаную падабраць гэтай аповесці сваю назву і пісьмова вытлумачыць выбар або напісаць эсэ пра маральную адказнасць "сваіх", якія вынішчалі носьбітаў духоўных традыцый нашага народа.

**VII. Рэфлексія.**

Працягніце фразу[4]:

1. Для моцнай асобы ёсць парог, пераступаць які нельга. В. Быкаў сваім творам патлумачыў гэта. На мой погляд, гэты парог – ... *(прыблізныя адказы: уласнае сумленне, прынцыпы, погляды).*

2. На маю думку, словы Гі дэ Мапасана поўнасцю адносяцца да гэтай аповесці таму, што...... — не адпавядаюць аповесці таму, што..... *(прыблізныя адказы: менавіта гэты твор адначасова ўяўляе сабой сімвал і дакладнае ўвасабленне рэчаіснасці).*

3. Урок даў мне для жыцця... *(прыблізныя адказы: разуменне важнасці жыцця без вайны, асуджэнне здрады).*

4. Наш урок прайшоў пад знакам....*(прыблізныя адказы: Памяці).*

Хочацца завяршыць наш урок словамі таго ж успомненага намі і любімага В. Быкавым Альберта Камю: "Усё, што чалавек здольны выйграць у гульні з чумой і з жыццём, – гэта веды і памяць".

*Дата поступления в редакцию: 08.06.23*

Дадатак 1

**Картка-дасье вобраза**

| | |
|---|---|
| Прозвішча і імя героя | |
| Дзейнасць у час Вялікай Айчыннай вайны | |
| Даваеннае жыццё героя | |
| Матывацыя таго, што ён стаў паліцаем | |
| Вашы адносіны да выбару героя ў экстрэмальнай сітуацыі | |

Дадатак 2

**Вобразы-сімвалы**

| Сімвал | Яго роля | Цытата |
|---|---|---|
| Варона | Сімвал няшчасця | "На ліпе пачала драць горла варона – каб хоць не на якую бяду, устрывожана падумала Сцепаніда". |
| | | |
| | | |

[4]Прапануецца на слайдзе прэзентацыі "Працягніце фразу".